**Лягчылава А.С.,** студ. гр. 302а БДУКМ
Навук. кір. – Гулак А.А.,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

# СВЯТА МАСЛЕНІЦЫ Ў МУЗЕЙНЫМ КОМПЛЕКСЕ “ДУДУТКІ”: КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

Культурна-массавае мерапрыемства – паняцце вельмі шырокае, якое ўключае разнастайныя віды святаў, фестываляў і ўрачыстасцяў. Падчас культурна-масавых мерапрыемстваў, распрацаваных і праведзеных на належным узроўні, адбываецца арганічнае спалучэнне праяўленняў духоўнай і матэрыяльнай культуры, зліццё розных відаў мастацтва і сучасных сацыяльных практык. Культурна-масавыя мерапрыемствы – мнагажанравыя відовішчы, у якіх спалучаюцца майстэрства вялікай колькасці прафесійных і самадзейных калектываў: музычных, спеўных і харэаграфічных, асобных выканаўцаў, народных майстроў, артыстаў эстрады і цырка і г.д. [1, с. 22].

У сучаснай культуралогіі даволі поўна апісаны віды культурна-дасугавай дзейнасці. Вядомыя працы на гэту тэму наступных даследчыкаў: А.І. Грыгор’ева «Культура досуга» (2007), А.Д. Жаркова «Теория и технология культурно-досуговой деятельности», Г.А. Аванесавай «Культурно-досуговая деятельность: теория и практика организации: учебное пособие для студентов вузов», Г.Л. Тульчынскага, «Менеджмент в сфере культуры» Т.Г Кісялевай, Ю.Д. Красільнікава «Социально-культурная деятельность» і інш.

Культурна-масавыя мерапрыемствы падзяляюцца на *культурна-дасугавыя* і *інфармацыйна-асветніцкія*. Тэмай нашага даследавання з’яўляецца якраз *культурна-дасугавае* мерапрыемства, таму для ацэнкі яго зместу ўкажам яго асноўныя віды: *свята* (дзяржаўнае, нацыянальнае, традыцыйнае, прафесійнае, сямейнае, горада, мікраараёна, сяла, вуліцы, фальклорнае, спартыўнае і інш); *вечар* (тэматычны, ўшанавання, адпачынку,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаёмстваў, сустрэчы, выпускны, літаратурны, паэзіі, музычны, песні і інш ); *канцэрт* (тэматычны, тэатралізаваны, справаздачны, сольны і інш); *народнае гулянне,* абрад, рытуал у адпаведнасці з мясцовымі звычаямі і традыцыямі (нацыянальнымі, сямейнымі, грамадзянскімі і інш); *выстава* (аўтарская, мастацкая, прыкладной творчасці, народных промыслаў); *кірмаш* (традыцыйная, рамёстваў, вакансій) і іншае [2, с. 21].

У нашай краіне значная роля адводзіцца мерапрыемствам, звязаным з народнай творчасцю. Часцей за усё – гэта народныя гулянні, рэканструкцыі старажытных абрадаў, выставы традыцыйных рамёстваў, фестывалі, конкурсы, звязаныя з народнай творчасцю, каляндарна-абрадавыя святы. Сярод апошніх найбольш развітыя і папулярныя *Масленіца, Гуканне вясны, Вялікдзень, Купалле, Дажынкі, Каляды.*

Масленіцу ў гэтым годзе святкавалі ў розных месцах: у музейным комплексе старажытных народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі», у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, у Рэспубліканскім гарналыжным цэнтры «Сілічы», у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі, а таксама на гарадскіх пляцоўках сталіцы, у раённых цэнтрах і іншых населеных пунктах. Актыўная рэклама абяцала выдатнае, адпаведнае народнай традыі свята Масленіцы ў музеі «Дудуткі» (адбылося 1 сакавіка).

Перш, чым зрабіць аналіз, адзначым, што абраднасць Масленіцы ўзнікла ў дахрысціянскую эпоху як рытуал сустрэчы першых праяў вясны і провадаў зімы. Гэта было вялікае свята для ўсіх прадстаўнікоў вясковай супольнасці, якое працягвалася пэўны час, а з прыняццем хрысціянства лакалізавалася ў перыяд тыдзень перад Вялікім пастом.

У наш час найбольш вядома тое, што Масленіца мае семантыку пераходу ад аднаго сезону да іншага. Але, як адзначаюць навукоўцы, «Масленіца – з'ява шматаспектная, яна ўлучае ў сабе пакланенне продкам; культ сям'і і шлюбу; спалучае шэраг жывёлагадоўчых абрадаў з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

земляробчымі; абрады і дзеянні, накіраваныя на забеспячэнне аховы сям'і і грамады» [3, с. 294].

Масленіца ў Дудутках праходзіць ужо дваццаты раз. У гэтым годзе з традыцыйных масленічных абрадаў у музейным комплексе быў рэалізаваны адзін з іх – провады зімы, які заключаўся толькі ў спальванні лялькі Зімы. Але, акрамя гэтага, на свяце адбылося некалькі майстар-класаў па народных танцах і частаванне «шляхецкімі прысмакамі», што таксама надало яму пэўнай аўтэнтычнасці. Усе астатнія забавы нельга аднесці да масленічных (стральба з лука, валоданне баявой сякерай і мячом, рыцарскія баі).

У Дудудках не было паказана ні адной рэканструкцыі традыцыйнага масленічнага абрада ці гульні, такіх як абрады «Масленічныя калодкі», «Масленічныя дзяды», адведванне бабак-павітух, гушканне на арэлях, забава «Круцёлка», катанне на конях. Таксама на свяце не было нават жывога выканання масленічных песень. Такім чынам, мерапрыемства ў «Дудудках» не адпавядала традыцыйнай Масленіцы, як гэта рэкламавалі арганізатары, бо не былі ўвасоблены асноўныя кампаненты абраду.

Андосна класіфікацыі, якая была вышэй, гэта свята можна аднесці да народнага гуляння з элементамі традыцыйнага масленічнага абраду. Мерапрыемства аказалася пераважна камерцыйным і не здолела аднавіць свята продкаў, як пра гэта заяўлялі арганізатары. Але выкананне культурна-дасугавай, рэкрэацыйнай функцыі арганізатарамі, можна лічыць, адбылося. Гэтаму садзейнічалі самі прыродна-культурныя ўмовы музейнага комплексу. У наведвальнікаў свята, відавочна, было жаданне далучацца да розных дзей. На карысць масавасці было і тое, што паміж навагоднімі гуляннямі і Масленіцай даволі працяглы перыяд нізкай святочнай актыўнасці.

Аднак, з пункту гледжання традыцыйнасці заяўленае свята не вытрымлівае крытыкі. Як ужо адзначалася вышэй, у ім не былі ўвасоблены асноўныя кампаненты абраду. Пры вялікім тэарэтычным і практычным вопыце арганізацыі народных каляндарных свят ў нашай краіне арганізатары мерапрыемства не прымянілі гэтыя здабыткі. Улічваючы, што Масленіца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дудудках адбываецца ўжо ў двадцаты раз, ацэнка яе правядзення павінна быць яшчэ больш крытычнай.

---

1. Жарков, А.Д. Клуб в дни всенародных праздников / А.Д. Жарков. – Москва : Профиздат, 1983. – 78 с.

2. Стрельцов, Ю.А. Культурология досуга : учеб. пособ. / Ю.А. Стрельцов. – Москва : МГУКИ, 2003. – 236 с.

3. Райкова, А. Масленіца / А. Райкова // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мінск : Беларусь, 2011. – 592 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ